**УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«11/18»**

# ПАХАВАННІ СПАСА-ЕЎФРАСІННЕЎСКАГА МАНАСТЫРА Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ ПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ ПОЛАЦКА

***канд. гіст. навук В.У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***e-mail: viktar.charauko@gmail.com***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0001-9594-0430***

*Пахаванні Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра займаюць асаблівае месца сярод пахавальных помнікаў Полацка. Пахаванні на гэтай тэрыторыі адбываліся яшчэ да стварэння манастыра і звязаны з пахавальным храмам полацкіх епіскапаў. Археалагічныя даследаванні апошніх гадоў дазваляюць выказаць здагадку, што Спаса-Праабражэнская царква і прылеглая да яе тэрыторыя выкарыстоўваліся для пахавання сацыяльнай эліты Полацкай зямлі. Гэта адпавядае высокаму статусу, які меў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр на працягу стагоддзяў.*

***Ключавыя словы:*** *пахаванні, могільнік, Полацк, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.*

**Уводзіны.** Нягледзячы на раскопкі некаторых сярэдневяковых і познесярэдневяковых манастыроў Беларусі [1, с. 108–117; 2], гэтыя археалагічныя аб'екты пакуль вывучаны недастаткова. Адной з актуальных праблем з'яўляецца развіццё пахавальных помнікаў, якія ўзніклі і існавалі пры манастырах. Таму археолага-архітэктурныя даследаванні Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, якія праводзяцца на працягу апошніх гадоў Полацкім дзяржаўным універсітэтам (Беларусь) (Дз.У. Дук, А.Л. Коц, І.В. Магалінскі) сумесна з Дзяржаўным Эрмітажам (Расія) (Я.М. Торшын) [3; 4], маюць важнае навуковае значэнне. На дадзены момант раскопкі не завершаны і будуць працягвацца. Асэнсаванне ўсяго комплексу атрыманых матэрыялаў, несумненна, дазволіць асвятліць розныя аспекты функцыянавання манастыра на працягу яго шматвяковай гісторыі. Адным з пытанняў павінна стаць удакладненне месца, якое займалі пахаванні Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра сярод пахавальных помнікаў Полацка [5, с. 130, 132].

**Асноўная частка.** Размешчаны па-за межамі сярэдневяковага Полацка, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр з'яўляўся асаблівым пасяленчым помнікам, адрозным ад іншых катэгорый пасяленняў: горада, вёскі, сельскай сядзібы. Як і любы манастыр, ён вылучаўся дэмаграфічным складам манастырскай абшчыны, спецыфікай яе папаўнення, бытавым укладам. У той жа час, размяшчэнне недалёка ад горада і цесная сувязь з гарадскім жыццём рабілі манастыр часткай культурна-рэлігійнай прасторы Полацка, няхай і тэрытарыяльна адасобленай. З манастыром, як з пасяленчым помнікам, павінен быў быць звязаны пахавальны помнік – могілкі, прызначаныя для прадстаўнікоў манастырскай абшчыны. Хрысціянская пахавальная традыцыя прадугледжвала пахаванне памерлых у храмах і на прыхрамавых могілках. Пры гэтым на пахаванне ў храмах маглі прэтэндаваць прадстаўнікі сацыяльнай эліты – князі і вышэйшае духавенства, баярства, святары. Асноўную масу насельніцтва хавалі на прыхрамавых могілках [6, с. 91–92].

Старажытныя пахаванні на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра былі здзейснены яшчэ да заснавання абіцелі. «Жыціе Еўфрасінні Полацкай» паведамляе, што на момант перадачы Еўфрасінні епіскапам Іллёй прыгараднага Сяльца, якое было падвор'ем Сафійскага сабора, там ужо мелася царква. Яна служыла месцам апошняга спачыну полацкіх архірэяў [7, с. 31; 8, с. 58]. Археалагічныя раскопкі М.К. Каргера дазволілі выявіць гэты храм. Уздоўж паўночнай і паўднёвай сцен яго асноўнага аб'ёма даследчыкам былі знойдзены рэшткі аркасоліяў, у якіх размяшчаліся саркафагі. Акрамя гэтага, ва ўсіх галерэях царквы знаходзіліся саркафагі з плінфы (малюнак 1): 7 з іх захавалася ў паўднёвай галерэі, 20 – у заходняй, 2 – у паўночнай. У паўночнай галерэі таксама мелася глыбокая крыпта. Па здагадцы М.К. Каргера, яна прызначалася для найбольш ганаровых пахаванняў [9, с. 241, 243]. З прычыны разбуранасці царквы пахаванні захаваліся не ва ўсіх скляпах. Большая частка парэшткаў належала мужчынам сталага ўзросту. Інвентар адсутнічаў [9, с. 244]. Гэта адпавядае згаданым у «Жыціі...» пахаванням епіскапаў. Пісьмовыя крыніцы захавалі імёны двух полацкіх епіскапаў – папярэднікаў Іллі: Міны і Касьмы [10, с. 27]. Пахаванне царкоўных іерархаў у гэтым храме магло працягвацца і пасля заснавання манастыра.

Па трапным назіранні А.А. Мельнікава, заснаваная на «Жыціі...» і замацаваная ў гістарыяграфіі традыцыя называння храма пахавальняй епіскапаў мімаволі прыводзіць да вузка спецыфічнага разумення яго прызначэння. Між тым, няма падстаў лічыць, што храм быў пабудаваны выключна для пахавання архірэяў і служыў толькі для гэтага [8, с. 58]. Частка пахаванняў магла належаць прадстаўнікам княжацкай дынастыі і баярскіх родаў – ктітарам царквы і манастыра. Акрамя мужчынскіх, у храме адкрыты і жаночыя пахаванні, якія, магчыма, адносяцца да больш позняга перыяду яго функцыянавання ў складзе абіцелі [9, с. 244]. Яны маглі належаць прадстаўніцам княжацкай сям'і, баярскіх родаў і настаяцельніцам манастыра.

Выкарыстанне храма спынілася пасля яго разбурэння, верагодна, у выніку пажару. Пра гэта сведчаць знойдзеныя ў адным са скляпоў кавалкі свінцу ад расплаўленага даху, у тым ліку і з уплаўленымі ў іх косткамі [9, с. 244; 11, с. 150]. Гэтым жа можна растлумачыць знаходку «напоўненага свінцом чэрапа», які ў 1920 г. аглядала павятовая камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва [12, с. 46].



**Малюнак 1. – Пахаванні ў саркафагах з храма-пахавальні Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра**
Паводле А.В. Вайцяховіча [6, с. 192].

Пахаванні здзяйсняліся і ў Спаскай царкве. Аб гэтым сведчаць аркасолii ў паўночнай і паўднёвай сценах храма, а таксама саркафагі пад яго галярэямі [4, с. 24, 33, 36]. Акрамя гэтага, на поўдзень ад асноўнага аб'ёму царквы быў адкрыты невялікі падземны храм з аркасоліям. Аркасолii і саркафагі маглі прызначацца для пахавання кціта раў [3, с. 47–48]. Не выключана, што ўнутры храма хавалі таксама настаяцельніц манастыра.

Пры манастыры павінны былі знаходзіцца могілкі, прызначаныя для шараговых прадстаўніц манаскай абшчыны, духавенства, а таксама для манастырскіх слуг і членаў іх сем'яў. Некропаль мог размяшчацца каля сцен Спаса-Праабражэнскай царквы. Памінальныя графіці гэтага храма XII – XV стст. (якія, вядома, не сведчаць аб абавязковым пахаванні названых асоб на манастырскіх могілках) згадваюць трох настаяцельніц (Кацярыну, Акуліну і не названую па імені ігуменню), двух святароў (Дзмітрыя і Івана), намесніка ігуменні, жонку іканапісца, а таксама прадстаўнікоў мясцовага баярскага роду Корсакаў, якія маглі выступаць у ролі кціта раў: Астафія Васільевіча, Івана Васільевіча Юр'еўніцкага, Зіновія Васільевіча Корсакаў (малюнак 2) [13, с. 110–123]. Наяўнасць кціта рскай падтрымкі манастыра ў Познім Сярэднявеччы сведчыла несумненна пра важную ролю ў рэлігійным жыцці Полацка, якую адыгрываў манастыр разам з Сафійскім саборам [14, с. 439].




**Малюнак 2. – Памінальныя графіці XII–XV стст. з узгадкай настаяцельніц Кацярыны (а), Акуліны (д), не названай ігуменні (г), святароў Дзмітрыя (б) і Івана (ж), намесніка ігуменні Антонія (е), жонкі іканапісца (в), мясцовых баяр Астафія, Івана, Зіновія Корсакаў (з) у Спаса-Праабражэнскай царкве Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра**
Паводле І.Л. Калечыц [13, с. 211–212, 215, 217–218, 221–222].

На сённяшні момант мы ведаем, што некропаль побач са Спаса-Праабражэнскай царквой дакладна існаваў у XVIII – XX стст. Гэта археалагічна пацверджана раскопкамі Дз.У. Дука, А.Л. Коца і І.У. Магалінскага. Большасць пахаванняў пашкоджана і пераадкладзена, што разам з пераважнай безынвентарнасцю ўскладняе дакладнае датаванне [3, с. 48; 15, с. 140–141, 144–145]. Не выключана, што сярод пераадкладзеных касцякоў маюцца больш раннія пахаванні, парушаныя пазнейшымі. Функцыянаванне могілак у XIX – XX стст. не выключае іх узнікнення раней за XVIII ст. Але інфармацыі аб грунтавых пахаваннях, якія датуюцца перыядам да XVIII ст., мы не маем. Новыя даныя могуць быць атрыманы падчас працягу археалагічных даследаванняў.

Паводле праведзенай В.А. Емяльянчык антрапалагічнай экспертызы, выяўленыя каля Спаса-Праабражэнскага храма парэшткі належалі больш чым сотні чалавек. Сярод іх былі мужчыны, жанчыны і дзеці. Некаторыя пахаваныя мелі баявыя траўмы [15, с. 140–141, 144–145]. Разнастайны дэмаграфічны склад памерлых указвае на тое, што на могілках, нават калі іх даследаваны фрагмент дзейнічаў да XVIII ст., хавалі не толькі насельніц манастыра. Выкарыстанне манастырскіх могілак свецкім насельніцтвам, у тым ліку пахаванні мужчын у жаночых манастырах, і наадварот, не супярэчыць хрысціянскім звычаям. Такая сітуацыя адзначана на некропалі каля полацкага Сафійскага сабора [16, с. 82] і шэрагу рускіх манастырскіх могілак [17, с. 315; 18, с. 30], таму адпавядае ўсходнеславянскай пахавальнай практыцы. Але полаўзроставы склад пахаваных і паказчыкі смяротнасці дарослых на гэтым некропалі не адрозніваюцца ад сітуацыі на гарадскіх могілках Полацка XVII – XVIII стст. [15, с. 145]. Гэта знаходзіць тлумачэнне ў гісторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, тэрыторыя якога ў другой палове XVI – XVIII ст. знаходзілася ва ўласнасці Ордэна езуітаў. Гэта на час перапыніла натуральнае развіццё абіцелі і яе пахавальных традыцый, паколькі могілкі перасталі быць манастырскімі.

У XVIII ст. пахаванні здзяйсняліся не толькі побач са Спаса-Праабражэнскім храмам, але і пад ім. У другой палове XVIII ст. пад царквой былі пабудаваны крыпты. У трох з васьмі крыпт Дз.У. Дук выявіў асобныя чалавечыя косткі, моцна пашкоджаныя і фрагментаваныя, што можа тлумачыцца перасыпаннем зямлі з прылеглай да царквы тэрыторыі і парушэннем больш ранніх пахаванняў. У адным са скляпоў знаходзілася калектыўнае перапахаванне. Антрапалагічная экспертыза, праведзеная В.А. Емяльянчык, устанавіла прыналежнасць парэшткаў шасці мужчынам сталага ўзросту. Касцякі былі абгорнутыя дарагой тканінай з сярэбранай ніццю. На розных касцях шкілета, у тым ліку на чарапах, адзначаны плямы ад медных вокіслаў, якія пакінулі дэталі вопраткі або ўпрыгажэнні. Гэта, разам з месцам пахавання, сведчыць аб высокім сацыяльным статусе памерлых. Прасочваюцца нанесеныя зброяй траўмы. Верагодна, крыпта прызначалася для пахавання шляхты і кіраўніцтва Ордэна езуітаў у Полацку [19, с. 83, 114; 20, с. 133; 21, с. 225–226; 22, с. 34].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі адбылося аднаўленне Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Тэрыторыя каля Спаса-Праабражэнскай царквы зноў стала выкарыстоўвацца для пахавання прадстаўніц манаскай абшчыны і прадстаўнікоў духавенства. У 1910 г. у манастыр былі ўрачыста дастаўлены мошчы Еўфрасінні Полацкай – заснавальніцы манастыра. Яны былі змешчаныя ў спецыяльную ра́ку, знаходзіліся ў інтэр'еры храма і былі даступны для пакланення вернікам. Такая асаблівая пахавальная традыцыя адлюстроўвала асабліва высокі статус Еўфрасінні Полацкай як святой і адпавядала праваслаўнай практыцы абыходжання з мошчамі святых.

**Заключэнне.** Такім чынам, пахаванні Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра займаюць адметнае месца ў кантэксце развіцця пахавальных помнікаў Полацка і могуць разглядацца як адзін з самых старажытных у Беларусі некропалей, спалучаючы пахавальныя помнікі розных эпох. Старажытныя пахаванні ўзніклі яшчэ да заснавання абіцелі і былі звязаны з храмам-пахавальняй полацкіх епіскапаў. Пахаванні ў гэтым храме і Спаса-Праабражэнскай царкве размяшчаліся ў аркасоліях і скляпах. Гэта адпавядала старажытнарускай традыцыі пахавання прадстаўнікоў сацыяльнай эліты – вышэйшага духавенства, членаў княжацкай сям'і, прадстаўнікоў баярскіх родаў, якія выступалі кцітарамі храма і манастыра. На тэрыторыі манастыра павінны былі існаваць і могілкі, прызначаныя для прадстаўнікоў манаскай абшчыны. На іх маглі таксама хаваць прадстаўнікоў духавенства, манастырскіх слуг, кцітараў і членаў іх сем'яў.

У Познім Сярэднявеччы традыцыя манументальнага культавага дойлідства была перарвана. Разам з ёй перапынілася і традыцыя пахавання ў каменных храмах. Храм-пахавальня полацкіх епіскапаў быў разбураны, як і галерэі Спаса-Праабражэнскай царквы. Верагодна, у гэты час працягвалі дзейнічаць манастырскія могілкі. У другой палове XVI ст. тэрыторыя манастыра перайшла да езуітаў. Каля Спаса-Праабражэнскай царквы, магчыма, на месцы старых праваслаўных могілак, не пазней чым у XVIII ст. узнік некропаль. У XVIII ст. пад старажытным Спаса-Праабражэнскім храмам былі пабудаваны крыпты, якія выкарыстоўваліся для пахавання шляхты і прадстаўнікоў езуіцкага Ордэна. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай праваслаўны жаночы манастыр аднавіў сваё існаванне. Тэрыторыя каля Спаса-Праабражэнскай царквы зноў стала выкарыстоўвацца для пахавання насельніц манастыра і прадстаўнікоў духавенства. Перанясенне ў адпаведнасці з праваслаўнай традыцыяй мошчаў Еўфрасінні Полацкай – заснавальніцы абіцелі –дазволіла Спаса-Еўфрасіннеўскаму манастыру канчаткова заняць унікальнае месца ў ліку пахавальных помнікаў Полацка.

ЛІТАРАТУРА

1. Археалогія Беларусі. У 4 т. – Мінск : Бел. навука, 1997–2001. – Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В.М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. – 2001. – 597 с.
2. Кошман, В.И. Кладбище бернардинского костёла в городе Минске (основные результаты археологического и антропологического изучения) / В.И. Кошман, О.А. Емельянчик // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2018. – Вып. 29. – С. 48–58.
3. Предварительные результаты археолого-архитектурных исследований на территории Спасо-Преображенского храма Спасо-Евфросиньевского монастыря в городе Полоцке в 2018 г. / И.В. Магалинский [и др.] // Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов : сб. науч. работ Междунар. науч.-практ. конф. К 50-летию

Полоцкого гос. ун-та, Новополоцк, 18–19 октября 2018 г. / под общ. ред. В.Е. Овсейчика (отв. ред.), Г.И. Захаркиной, Р.М. Платоновой. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2018. – С. 45–50.
4. Галерея Спасо-Преображенской церкви Евфросиньева монастыря в Полоцке (предварительные итоги архитектурно-археологических исследований) / Е.Н. Торшин [и др.] // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. III Міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14–15 крас. 2016 г. : у 2 ч. / Пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача, А.І. Корсак. – Наваполацк : ПДУ, 2016. – Ч. 1. – С. 22–40.
5. Чараўко, В.У. Пахавальныя помнікі Полацка XIV–XVIII стст. / В.У. Чараўко // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2019. – № 1. – С. 129–135.
6. Войтехович, А.В. Погребальный обряд населения Полоцкой земли в X–XII вв. / А.В. Войтехович. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 269 с.
7. Кніга жыцій і хаджэнняў / Уклад., прадм. і камент. А. Мельнікава. – Мінск : Маст. літ-ра, 1994. – 503 с.
8. Мельнікаў, А.А. З неапублікаванай спадчыны : манаграфіі, артыкулы, вершы, матэрыялы навуковай канферэнцыі, успаміны сучаснікаў / А.А. Мельнікаў. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2005. – 592 с.
9. Каргер, М.К. Храм-усыпальница в Ефросиньевском монастыре в Полоцке / М.К. Каргер // Советская археология. – 1977. – № 1. – С. 240–247.
10. Грыгаровіч, І.І. Беларуская іерархія / І.І. Грыгаровіч. – Мінск : БелЭн, 1992. – 102 с.
11. Раппопорт, П.А. Полоцкое зодчество XII в. / П.А. Раппопорт // Советская археология. – 1980. – № 3. – С. 142–161.
12. Православная церковь на Витебщине (1918–1991) : док. и материалы / Редкол.: М.В. Пищулёнок (гл. ред.) [и др.] ; сост. В.П. Коханко (отв. ред.) [и др.]. – Минск : НАРБ, 2006. – 365 с. ; ил.
13. Калечыц, І.Л. Эпіграфіка Беларусі X–XIV стст. / І.Л. Калечыц. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 271 с.
14. Воронин, В.А. Храмовое и монастырское строительство в XIII–XVI вв. / В.А. Воронин // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко. – Минск : Беларуская навука, 2012. – С. 437–444.
15. Емельянчик, О.А. Антропологические исследования материалов погребений при Спасо-Преображенской церкви Спасо-Евфросиниевского монастыря в Полоцке / О.А. Емельянчик // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. III Міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14–15 крас. 2016 г. : у 2 ч. / Пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача, А.І. Корсак. – Наваполацк : ПДУ, 2016. – Ч. 1. – С. 140–146.
16. Полоцк. Археологические раскопки // Известия императорской археологической комиссии. Прибавление к вып. 52-му. – СПб. : Тип. гл. управ-я уделов, 1914. – С. 82–83.
17. Беляев, Л.А. Усыпальница князей Хованских и Пожарских в Суздальском Спасо-Евфимиевом монастыре: новый этап историко-археологических исследований / Л.А. Беляев // Исторические записки. – М., 2010. – Вып. 13 (131). – С. 307–323.
18. Шокарев, С.Ю. Как формировались боярские усыпальницы Москвы: к постановке вопроса / С.Ю. Шокарев // Российская генеалогия. Науч. альм. – М., 2018. – Вып. 3. – С. 7–38.
19. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д.У. Дук – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с.
20. Дэйніс, І.П. Полацкая даўніна / І.П. Дэйніс. – Мінск : Медисонт, 2007. – 330 с.
21. Емяльянчык, В.А. Вынікі антрапалагічнай экспертызы астэалагічных матэрыялаў з крыптаў Спаскай царквы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра / В.А. Емяльянчык // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 2006. – Вып. 21. – С. 224–239.
22. Емяльянчык, В.А. Вынікі антрапалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў 1998–2008 гады / В.А. Емяльянчык // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 лістап. 2008 г. / Пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 30–37.

*Паступіў 29.12.2021*

## ПОГРЕБЕНИЯ СПАСО-ЕВФРОСИНИЕВСКОГО МОНАСТЫРЯ В КОНТЕКСТЕ РАЗВИТИЯ ПОГРЕБАЛЬНЫХ ПАМЯТНИКОВ ПОЛОЦКА

***В.В. ЧЕРЕВКО***

*Погребения Спасо-Евфросиниевского монастыря занимают особое место среди погребальных памятников Полоцка. Погребения на этой территории существовали ещё до создания монастыря и связаны с погребальным храмом полоцких епископов. Археологические исследования последних лет позволяют высказать догадку, что Спасо-Преображенская церковь и прилегающая к ней территория использовались для погребения социальной элиты Полоцкой земли. Это соответствует высокому статусу Спасо-Евфросиниевского монастыря на протяжении столетий.*

***Ключевые слова:*** *погребения, могильник, Полоцк, Спасо-Евфросиниевский монастырь.*

## BURIALS OF THE SAINT EUPHROSYNE MONASTERY IN THE CONTEXT OF THE DEVELOPMENT OF THE POLOCK FUNERAL MONUMENTS

***V. CHARAUKO***

*Among the funerary monuments of Polotsk, a special place is occupied by the churchyard of the Saint Euphrosyne monastery. Burials on this territory took place even before the creation of the monastery and are associated with the funeral church of the Polotsk bishops. Archaeological research in recent years suggests that the Spas church and the surrounding area were used to bury the social elite of Polotsk land. This corresponds to the high status that the Saint Euphrosyne monastery possessed for several centuries.*

***Keywords:*** *burials, churchyard, Polotsk, Saint Euphrosyne monastery.*